# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
## П'еса Янкі Купалы «Паўлінка

Вызначце адзін ці некалькі правільных адказаў.

**1. Праца над «Паўлінкай» была завершана:**

1) 1 снежня 1909 годзе ў Санкт-Пецярбургу;
2) 3 чэрвеня 1912 года ў Акопах;
3) 16 ліпеня 1903 года ў Вязынцы;
4) 10 лютага 1907 года ў Смалярні;
5) 15 верасня 1915 года ў Маскве.

**2. Упершыню «Паўлінка» была пастаўлена на сцэне:**

1) 14 лютага 1913 года ў Санкт-Пецярбургу;
2) 21 снежня 1912 года ў Маскве;
3) 12 снежня 1912 года ў Мінску;
4) 27 студзеня 1913 года ў Вільні;
5) 8 сакавіка 1914 года ў Кіеве.

**3. П'еса «Паўлінка» ў жанравых адносінах — гэта:**

1) драма;
2) трагедыя;
3) камедыя;
4) меладрама;
5) фарс-вадэвіль.

**4. Пры напісанні «Паўлінкі» Янка Купала выкарыстаў вопыт беларускіх драматургаў:**

1) Алеся Гаруна;
2) Івана Катлярэўскага;
3) Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча;
4) Францішка Апяхновіча;
5) Каруся Каганца.

**5. З Адольфа Быкоўскага адкрыта кпяць:**

1) Паўлінка;
2) Альжбета;
3) Якім;
4) усе, акрамя Сцяпана Крыніцкага;
5) Пранцісь.

**6. Якім Сарока па прафесіі:**

1)судовы следчы;
2) панскі пастух;
3) земскі ўрач;
4) вандроўны музыка;
5) вясковы настаўнік.

**7. Якіма арыштоўваюць за:**

1) падпольную дзейнасць;
2) прафесійную (настаўніцкую) дзейнасць;
3) прапагандысцка-рэвалюцыйную дзейнасць;
4) супрацоўніцтва з ворагам;
5) заляцанне да Паўлінкі.

**8. Якіма арыштавалі па даносе:**

1) Пустарэвіча;
2) Крыніцкага;
3) Быкоўскага;
4) Агаты;
5) Альжбеты.

**9. Якая цэнтральная дзейная асоба паяўляецца на сцэне адзін раз на працягу развіцця дзеяння п'есы?**

1) Паўлінка;
2) Агата;
3) Сцяпан;
4) Пранцісь;
5) Якім.

**10. Вядучым персанажам у канфлікце камедыі, «рупарам» аўтара з'яўляецца:**

1) Сцяпан Крыніцкі;
2) Пранцісь Пустарэвіч;
3) Паўлінка Крыніцкая;
4) Адольф Быкоўскі;
5) Якім Сарока.

**11. Маладую Беларусь у п'есе ўвасабляюць:**

1) музыкі;
2) Альжбета;
3) Якім;
4) госці;
5) Паўлінка.

**12. Вобраз Сцяпана Крыніцкага ў п'есе паказаны ў наступных планах:**

1)гумарыстычным;
2)іранічным;
3) сатырычным;
4) гратэскавым;
5) камедыйным.

**13. Як паўплываў Якім на Паўлінку?**

1) Пашырыў светапогляд і многаму навучыў;
2) зняў з вачэй сацыяльную «слепату»;
3) азарыў рамантычным святлом новых ідэй;
4) пасяліў у сэрцы жаданне вырвацца з вясковай цемнаты, шляхецкай заскарузласці;
5) ніяк не паўплываў, бо Паўлінка мае свой погляд на жыццё.

**14. Прататыпаў маюць персанажы твора:**

1) Адольф Быкоўскі;
2) Сцяпан Крыніцкі;
3) Пранцісь Пустарэвіч;
4) Альжбета;
5) Якім Сарока.

**15. З камедыі Паўлінка паўстае як:**

1) дзяўчына з прыродным розумам, упартая, рашучая, разумная, вострая на язык;

LIVEWORKSHEETS

2) задзірыстая, непрыступная, пакорлівая, палкая ў залежнасці ад сітуацыі;

3) увасабленне маладой Беларусі, настойлівая, прынцыповая, прыгожая, прывабная, абаяльная, умее выслухаць, тонка адчувае гумар;

4) сімвал жаночай прыгажосці, мае цвёрды характер і свой погляд на жыццё;

5) багатая натура, шчодрая, таленавітая, непакорная, вольналюбівая, якая пратэстуе супраць свайго прыгнечанага, бяспраўнага становішча ў сям'і.

**16. Адольф Быкоўскі ў п'есе:**

1) 'тупы, пыхлівы, духоўна нікчэмны;

2) фанабэрысты, ганарысты, абмежаваны шляхцюк;

3) мае прэтэнзіі на арыстакратызм, здрадзіў свайму народу;

4) хвалько, недальнабачны, усюды падкрэслівае сваю «панскасць»;

5) зняважліва ставіцца да культуры і мовы сваіх бацькоў.

**17. Якім Сарока ў творы:**

1) бедны, «палітычна небяспечны», «дэмакрат», «забастоўшчык», «бязбожнік»;

2) інтэлігент-гуманіст, прынцыповы, настойлівы;

3) носьбіт новых ідэй, перадавы чалавек вёскі;

4) моцна, шчыра, адцана кахае Паўлінку;

5) бунтар і абаронца «ўсіх сляпых».

**18. П'еса «Паўлінка», на думку даследчыкаў, у развіцці дзеяння мае наступныя планы:**

1) рэалістычна-бытавы;

2) алегарычна-сімвалічны;

3) рэалістычна-натуралістычны;

4) рамантычна-алегарычны;

5) сімвалічна-фантастычны.

**19. Імя і прозвішча якога героя п'есы ператварылася з уласнага ў агульнае, назыўное:**

1) такога героя ў камедыі няма;

2) Сцяпана Крыніцкага;

3) Пранціся Пустарэвіча;

4) Якіма Сарокі;

5) Адольфа Быкоўскага.

**20. Кульмінацыяй п'есы з'яўляе(ю)цца:**

1) сцэна, калі Крыніцкі рве фотаздымкі Якіма;

2) момант з'яўлення Быкоўскага першы раз на сцэне;

3) эпізод, калі Быкоўскі вучыць Паўлінку танцам;

4) сцэна, калі Паўлінка праз акно выкідвае вузлы і збіраецца выскачыць сама;

5) словы Сцяпана, адрасаваныя Паўлінцы, аб тым, што арыштавалі Якіма.

**21. Праблема рэнегацтва ў першую чаргу раскрываецца праз вобраз:**

1) Адольфа Быкоўскага;

2) Пранціся Пустарэвіча;

3) Сцяпана Крыніцкага;

4) Агаты Пустарэвіч;

5) Якіма Сарокі.

**22. У п'есе Янка Купала ўздымае праблемы:**

1) нацыянальнага адраджэння;

2) выхавання маладога пакалення;

3) філасофскага асэнсавання жыцця;

4) узаемаадносін бацькоў і дзяцей;

5) касмапалітызму і рэнегацтва.

**23. П'есе надае вадэвільны характар увядзенне ў яе структуру:**

1) разваг (маналогаў) галоўных герояў;

2) любоўнага трохкутніка;

3) песень;

4) прыпевак;

5) танцаў.

**24. Асаблівасцямі п'есы «Паўлінка» з'яўляюцца:**

1) арыгінальныя камічныя сітуацыі, іранічнае падсмейванне;

2) сувязь з фальклорам;

3) трапная і каларытная мова персанажаў;

4) вострыя сацыяльныя праблемы раскрываюцца на бытавым матэрыяле;

5) сюжэт будуецца на супрацьпастаўленні Паўлінкі і Быкоўскага.

**25. «Паўлінка» з'яўляецца камедыяй, таму што:**

1) у ёй высмейваюцца заганы шляхты;

2) ёсць сатырычны вобраз Быкоўскага;

3) прысутнічае камічны дуэт Пустарэвічаў;

4) створаны камічныя сітуацыі;

5) ёсць элементы гратэску.

LIVEWORKSHEETS